

Дзвінскі ўзгорак

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №7 (23)
ТРАВЕНЬ 2015 ГОДА

МАРТЫРАЛОГ

ОБНАРУЖИЛИ ВЫКОПАННЫЕ ОСТАНКИ ЛЮДЕЙ

На предполагаемом месте массовых расстрелов в лесном массиве у деревень Дреколье и Хайсы Витебского района в одной из братских могил обнаружены выкопанные останки как минимум 15 человек.

28 апреля активисты из Витебска отправились в лес, где осенью у найденных ям с человеческими костями были установлены несколько крестов, чтобы возложить цветы и убрать сучья, нападавшие после сильных ветров.

На месте, где, по словам окрестных жителей, перед войной расстреливали людей, явно бывали и другие посетители. У двух ям валялись брошенные, очевидно представителями следственных органов, одноразовые медицинские перчатки. В еще одной могиле собравшихся ждала более интересная находка — здесь явно кто-то вел раскопки.

В этой братской могиле, очевидно эксгумированной хуже остальных, на части дна было сделано заглубление на 50-60 сантиметров площадью около квадратного метра. За счет этого на срезе стали хорошо видны слои залегания костных останков. Выбранные из раскопа кости и остатки обуви неизвестные сложили в две кучки на незатронутой ими части ямы, забросав листьями и еловыми лапками.

Борис Хамайда подсчитал выкопанные кости и насчитал 30 бедренных костей, то есть они принадлежали как минимум 15 человекам. Кроме того он насчитал около 200 различных костей и фрагментов черепов, в том числе был найден один череп с отверстием похожим на выходное пулевое.

Кроме костных останков листьями были присыпаны выкопанные части истлевшей обуви — в основном кожаные и резиновые подошвы. На остатках резиновой обуви удалось обнаружить советские фабричные клейма и даты — 1936 и 1937 годов, дающие возможность предполагать, что это захоронение было сделано не ранее 1937 года.

Член Консервативно-христианской партии БНФ Ян Державцев высказал предположение, что раскопки могли вести представители спецслужб, однако вряд ли бы они оставили выкопанное на месте. Не смотря на то, что верхнюю границу датировки установить сейчас не возможно, активисты придерживаются мысли, что похороненные в этом месте люди были казнены органами НКВД во время сталинских репрессий перед Великой Отечественной войной.

По факту своей находки они собираются подать заявление в отдел следственного комитета по Витебскому району.

На этот раз корреспонденту «Народных новостей Витебска» удалось точно подсчитать количество ям — на обследованном участке их 9. Однако не во всех ямах на поверхности видны кости, а 2 или 3 из них больше похожи остатки землянок, правда, никаких деревянных конструкций внутри не сохранилось. Кроме того на прилегающей территории много холмиков по размерам близким к найденным ямам и Ян Державцев склонен их считать не эксгумированными могилами.

После небольшой уборки витебские активисты завершили свое посещение места массового захоронения совместной молитвой за упокой душ погибших здесь людей.

Сяржук Серабро
«Народныя навіны Віцебска»

ПАЛІТЫЧНАЯ КАМПАНІЯ

З ЧЫМ АПАЗІЦЫЯ ПОЙДЗЕ НА ВЫБАРЫ?

Апазіцыя плануе заслужыць давер выбаршчыкаў празрыстай прэзідэнцкай кампаніяй і скіраванасцю на пазітыўныя змены.

Аб'яднаць намаганні апазіцыя вырашыла ўжо пачынаючы з агульнай пазіцыі падчас правядзення саміта Усходняга партнёрства ў Рызе. Працягне працаваць разам на прэзідэнцкіх выбарах гэтага года, а таксама на парламенцкіх выбарах у 2016 годзе.

Гэтая праца стане двухгадовай кампаніяй, скіраванай на прасоўванне ідэй мірных пераменаў і развіцця.

Выканаўца абавязкаў кіраўніка грамадскай кампаніі «Гавары праўду» Андрэй Дзмітрыеў кажа, што на восеньскіх прэзідэнцкіх выбарах апазіцыя будзе прадстаўлена ў новым іміджы.

– Мы плануем выйсці з дэпрэсіі, пастаяннага жалобнага спева і паказаць, што апазіцыя ёсць адэкватная і цікавая. Яна мае бачанне будучыні беларускай прасторы, – расказвае ён.

Адзіным кандыдатам ад кааліцыі «Народны рэферэндум» на выбары абраная актывістка кампаніі «Гавары праўду» Таццяна Караткевіч.

Андрэй Дзмітрыеў лічыць, што вылучэнне Таццяны Караткевіч кандыдатам у прэзідэнты, а таксама празрыстая кампанія, стануць крокам у новым накірунку і дазволяць павысіць давер грамадзян да апазіцыі.

– Выходзячы з мінулага вопыту, мы хочам выйсці з напрацаванага кола, каб вызваць давер у грамадства. Мы хочам, каб улада зразумела, што ў краіне жыве не толькі яна і людзі, якія яе падтрымліваюць, але ўжо ёсць вялізарная колькасць людзей, якія думаюць інакш, і яны не становяцца з-за гэтага ворагамі. Яны – гэта частка краіны, з якой трэбы лічыцца і размаўляць, – тлумачыць Андрэй Дзмітрыеў.

Кто способен победить Лукашенко на выборах?

Прадстаўнікі чатырох арганізацый, якія падтрымалі кампанію «Народны рэферэндум», увойдуць ў яе каардынацыйны штаб і будуць кіраваць рознымі напрамкамі сумеснай працы.

Правядзеннем палітычный кампаніі зоймецца «Гавары праўду». Адзіны спіс кандыдатаў на парламенцкія выбары 2016 года пачала і працягне фарміраваць партыя БНФ. Рух «За Свабоду» стане адказным за грамадзянскую кампанію у межах «Народнага рэферэндума». Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) будзе каардынаваць супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых дэмакратычных сіл.

Разам з палітычнымі лозунгамі працягнецца праца над грамадскай кампаніяй «Народны рэферэндум». А менавіта зборам подпісаў у падтрымку шасці вылучаных пытанняў.

– Падчас прэзідэнцкай кампаніі мы зможам выйсці на лічбу ў 250 тысяч подпісаў і яшчэ не менш за 250 тысяч у наступным годзе,– упэўнены намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксей Сігаеў, які ў штабе будзе адказным за грамадзянскую кампанію.

Грамадства становіцца больш актыўным падчас выбарчых кампаній. Таму гэта добрая магчымасць пазнаёміць людзей са змястоўнай часткай рэферэндума.

– Згодна з апытаннямі Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, больш за траціну грамадзян ведаюць пра існаванне ініцыятывы «Народны рэферэндум», і 49% з іх жадаюць, каб у Беларусі адбыўся гэты рэферэндум, – кажа першы намеснік старшыні руху "За Свабоду" Юрась Губарэвіч.

Улада сёння знаходзіцца ў непростай сітуацыі: з аднаго боку трэба даваць людзям адказы на сацыяльныя пытанні, звязаныя з крызісам і пагаршэннем узроўня жыцця, з іншага боку ёсць пагроза незалежнасці. І няма гарантыі, што ўлада зможа захаваць свае пазіцыі, калі не будзе абапірацца на падтрымку большасці. І калі гэтая большасць кансалідавана будзе нешта ў яе патрабаваць, ёй прыйдзецца імкнуцца да пераменаў, лічыць прадстаўнік руху «За Свабоду».

Таксама запланаваная рапрацоўка адмысловых законапраектаў па пытаннях, звязаных з Народным рэферэндумам і больш шырокага спектра.

У бліжэйшых планах кааліцыі падняць пытанне рэфармавання медыцыны і выбарнасці мэраў гарадоў мясцовымі жыхарамі. Падчас прэзідэнцкай кампаніі плануецца вынесці на грамадскае слуханне пытанне абмежавання знаходжання кіраўніка дзяржавы ва ўладзе двума тэрмінамі.

У эканоміцы лідары апазіцыі чакаюць пастаянных правілаў для прыватнага сектара, якія б дазвалялі яму пашырацца. На думку Андрэя Дзмітрыева, гэта неабходна таксама ўладам, каб вырашыць праблему з нарастаючым беспрацоўем.

У адукацыі і медыцыне, па словах лідара кампаніі «Гавары праўду», ёсць шмат добрых распрацовак у міністэрствах.

– Ёсць добрыя прафесіяналы ўнутры улады, якія ведаюць, як вырашаць праблемы ў медыцыне і адукацыі. Але яны не могуць гэтага зрабіць, бо ў краіне няма на гэта палітычнай волі, – кажа ён.

Надзея Калініна

МАСТАЦТВА

ВЫСТАВКА «ПОРТРЕТ ГОРОДА» ОТКРЫЛАСЬ

Портреты деятелей культуры Витебска представил Владимир Литвин и собрал на презентации много интересных творческих людей.

Как признавался сам художник: «Я не ожидал такого резонанса. Я думал, что куда-то в сельскую библиотеку привезу, здесь что-то повисит в тишине и никого не будет. Я думал, что отвожу в ссылку эти портреты. А оказалось совсем по-другому». Действительно, заведующая библиотекой, известная поэтесса Наталья Соловьёва умеет объединять вокруг себя творческих людей.

И в этот последний апрельский день в посёлке Кировском за чертой города собрались художники, поэты, библиотечные работники и другие заинтересованные люди.

Отличительное качество самого Владимира Литвина – несомненная внутренняя позитивность, и его можно было бы охарактеризовать как человека прямого и «простого сердцем», но отнюдь не простодушного. При созерцании написанных им портретов возникает доверие к художнику и тем людям, которые изображены. Не остаётся сомнений в том, что живописец изображает портретируемых с любовью, или, по крайней мере, с большим уважением. Картины приближают деятелей культуры, которые, возможно, казались весьма далёкими и малоизвестными, к обычным людям, делая их близкими и знакомыми для всех.

Вообще, портретный жанр – не единственное, чем знаменит Владимир Литвин. Первым значимым, целенаправленным и большим по протяжённости этапом его творческой деятельности было создание «семейного портрета» в особом смысле данного понятия: «Я начал воссоздавать своё родовое древо и тему семьи как "малой церкви". Я сумел поднять архивные материалы по своему роду, и до шестого колена докопался. На примере своего родового древа я показал, что семья – это первооснова. Здесь назидание всем: семья – это главное и первичное, что определено Создателем».

Как отметил живописец на открытии выставки, тема рода и семьи у него выражалась, скорее, «для внутреннего пользования, для своих потомков, для своего музея».

Эту тему в характерной для себя манере коснулась и Наталья Соловьёва, которая вела открытие выставки, превратившееся в своеобразный творческий вечер художника: «Я хочу сказать, что Владимир Эдуардович – человек даже опасный. Он всё наблюдает, всё замечает, и мне кажется, что портретируемые даже сами не ожидали… Я очень много слышала отрицательных отзывов от женщин, потому что он уловил их суть. Может быть, он рисовал красавиц, но у кого-то читается лицемерие, у кого-то даже доносительство. Есть здесь такие портреты… Сначала я была против них, но Владимир Эдуардович сказал, что это его портреты, и я подумала, что всё равно там всё читается, так и пусть висят».

В любом случае, присутствующие на открытии выставки художники оказали своему коллеге полную поддержку. Говоря о подходе к написанию портретов, Владимир Вольнов напомнил: «Художник не может быть угодником по принципу "что изволите"?». Он отметил, что не надо оглядываться на тех, кто испытывает зависть или творческую неприязнь: «Тебе на этом пути надо быть стоиком, не прислушиваться, что о тебе говорят. Большой художник в том и состоит, чтобы не замечать, что о нём говорят. Потому что время всё расставит». Владимир Вольнов пожелал коллеге идти дальше, вглубь истории, и уже писать портреты не только современников, но и деятелей культуры Витебщины прошлых времён.

Олег Сковородко отметил, что все портреты удались, и все они сделаны в сдержанной, спокойной гамме. Феликс Гуменсказал, что в портретах удалось выразить не только сходство, но и заглянуть во внутренний мир человека. Он подчеркнул, что выставка выражает важную культурную тенденцию: «Владимир Литвин очень благородную задачу поставил перед собой: создать портрет современника».

Также художники поделились мнением об уместности подобной выставки именно в стенах библиотеки. Феликс Гумен в данном смысле говорил о позитивном значении библиотеки как «рассадника культуры», а Владимир Вольнов высказался о символичности экспозиции в этом месте, когда рядом расположены литературные классики и живые классики в портретах.

Так как открытие выставки проходило в самый канун майских праздников, в нём были и патриотические ноты. Тем более, что ряд портретируемых относятся к поколению, заставшему войну. Учителя Старосельской детской школы искусств внесли большой творческий вклад в проведение открытия выставки, и выступали с такими песнями, как «Майский вальс», «На безымянной высоте», «В землянке». Бард Сергей Лузгин исполнил «Тёмную ночь», а другой представитель жанра авторской песни Сергей Коробкин пел о любви. Созвездие творческих имён было не только на портретах, но и на самом мероприятии, и мы повторимся, что это заслуга замечательной поэтессы Натальи Соловьёвой, организовавшей великолепный вечер.

Георгий Корженевский
«Народныя навіны Віцебска»

НАША ЖЫЦЦЁ

ДАРОГА ЖЫЦЦЯ, АБО МЕЛЕЖАЎСКІ ПАРОМ

Карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў сябе ў ролі паромшчыка. І раіць чытаць гэты рэпартаж, слухаючы шлягеры савецкіх часоў, узгаданыя ніжэй.

Не толькі славутасць, але і неабходнасць

Вядома ж, «гімнам» напярэдадні падрыхтоўкі рэпартажу стала папулярная і ў наш час песня пра паромшчыка. Але на месцы аказалася, што ў рэальным жыцці ўсё не зусім так, як спявае Ала Пугачова.

Праўда, што «плыве паром, спявае вада пра нешта побач… То бераг левы патрэбны ім, то бераг правы…» А вось многае іншае не адпавядае рэальнасці. На паромнай пераправе, дзе працаваў журналіст, было двое паромшчыкаў. І тыя, да якіх напрасіўся ў памагатыя, былі не сівымі, а… панурымі. Праўда, перад развітаннем паромшчыкі шчыра смяяліся. Але ўсё па парадку.

У гарадскім пасёлку Сураж Віцебскага раёна нас сустрэў старшыня сельскага выканкама Аляксандр Вялітчанка. Ён распавёў, што летась Суражу споўнілася 450 гадоў! «На сёння ў нас жывуць каля 970 чалавек, у тым ліку меней за 100 — на тым беразе Заходняй Дзвіны».

«Гарадок наш падзяляе рака… Я жыву на адным, ну а ты — на другім на высокім беразе, на стромкім», успомніў я песню нашага земляка Антонава.

Паводле слоў тутэйшых, паром быў «заўсёды». Краязнаўцы расказвалі, што ён курсіруе больш за 70 гадоў. Нават у папулярнай сярод карыстальнікаў інтэрнэту «Вікіпедыі» дзеючая паромная пераправа ўзгадана як славутасць. Між іншым, мала хто ведае: у пасёлку нарадзіўся юрыст і эканаміст Захар Кацэненбаум. Пасля рэвалюцыі яго подпіс быў на грошах. І менавіта гэты хлопчык з беларускага мястэчка быў адным з заснавальнікаў Дзяржбанка СССР.

— Каму — «забава», а многім тутэйшым без парома ніяк? — цікаўлюся.

— Ну, гэта ж толькі ў пэўны час года: вясной і восенню, калі вада вялікая. У крыгаход, вядома, паром не ходзіць. Але ўжо праз некалькі дзён пасля таго, як лёд сыдзе, запускаем катар, — папраўляе мяне Аляксандр Вялітчанка.

Катар мае назву «Тытанік»! І каму толькі ў галаву прыйшла ідэя даць такую назву працавітаму маленькаму судну?

— Перасяліць? Ды не пераедуць, бо там прыватныя дамы, агароды. Плюс шэраг дамоў — дачы. Нельга сказаць, што людзі без парома пазбаўлены цывілізацыі на супрацьлеглым беразе… Крама ёсць. Па серадах туды прыязджае машына бройлернай птушкафабрыкі. Калі медыцынская дапамога патрэбна, «хуткая» прыедзе, бо таксама ёсць дарога на Віцебск. Пошта — усяго за 3,5 кіламетра ў суседняй вёсцы. Наконт школы, калі не памыляюся, толькі восем дзяцей на тым беразе. Калі не могуць хадзіць у суражскую школу, наведваюць у Заполлі. Да яе кіламетраў з 14. А вось Суражскі лясгас насамрэч «пакутуе». Вытворчы цэх на тым баку, адміністрацыя — тут. Калі рабочых і на катары перавезці можна, то іншае — складана… А без парома даводзіцца на той бераг ехаць у аб'езд прыкладна 80 кіламетраў. Я маю на ўвазе, калі цераз мост у Рубе (прыгарад Віцебска. — Аўт.), — працягвае Аляксандр Вялітчанка.

Пра тое, што Суражу патрэбны мост, не пісаў толькі самы лянівы журналіст. Каб не стварыць нездаровы ажыятаж, у райвыканкаме перспектыву не афішуюць. Зразумела, людзі адразу ж пачнуць цікавіцца, калі пабудуюць. Журналісту адказныя асобы паведамілі, што пытанне вывучаецца. Магчыма, і з'явіцца ў найбліжэйшыя гады параўнальна недарагі мост, з металічных секцый. Вось у расійскім Веліжы, напрыклад, ваенныя пабудавалі вялікі аўтадарожны разборны мост. Дык няўжо нашы не змогуць? А ў Бешанковічах, дзякуючы армейцам, гадоў шэсць таму ўпершыню ўсталявалі пантонны мост. Адтуль, дарэчы, перадалі Суражу стары паром, які цяпер і функцыянуе. А былы суражскі на беразе чакае рамонту. Працуючы ж таксама не вечны, дык і будзе яму замена. І зноў па чарзе…

Катар «Тытанік»

Працуе ён тут каля чатырох гадоў. Дзяжурства суткі праз трое. На пароме ёсць службовае «памяшканне» з «буржуйкай». Ля яе даволі ўтульна, паромшчыкі там снедаюць. І для пасажыраў ёсць вялікая «будка» з лаўкай. Але падчас касога дажджу або моцнага ветру там, мякка кажучы, не курорт. На той бераг паром ідзе хвілін 6-7. Шырыня ракі — прыкладна 150 метраў.

Плацяць паромшчыкам каля 2,5 мільёна рублёў у месяц. Пры такім рэжыме працы і нядрэнна.

Пераправа працуе з 6.30 раніцы, кожныя 30 хвілін возім людзей на той бераг. І так да вечара. А потым перавозяць толькі экстранныя службы: «хуткую», пажарных, газавікоў. Паромшчыкі сказалі, што такое здараецца часта.

— Усю ноч можам туды-сюды вазіць. Не, закаханыя не прасіліся, каб на спатканне… У альтанцы на беразе цалуюцца. Ды і не агучваў ніхто тэлеграму з парома нашага, як у камедыі (смяецца). Трос надзейны, на пару сезонаў хапае. Калі ўжо насамрэч падвядзе нешта, дык катар жа ёсць. Зможам дайсці па вадзе і зрабіць усё, што трэба, — распавядае Аляксандр Цішкін.

Што цікава, гэты самы паром быў «кіназоркай». Калі эксплуатаваўся ў Бешанковічах, яго знялі ў фільме па рамане Івана Мележа… Здымалі ў 1980-я гады.

І стаў я… берагавым!

Убачыўшы надпіс вялікімі літарамі звонку «кабінета» паромшчыка: «ПЕРАПРАВА БЕСПЛАТНО. РБ, РФ» падумаў, што нехта пажартаваў. Але высветлілася: знайшоўся «разумнік», які спрабаваў зарабіць на перавозцы.

У лістападзе мінулага года ў Смаленскай вобласці ў гарадку Веліж асеў мост цераз Заходнюю Дзвіну. Да беларускага Суража меней за 44 кіламетры. Вось і паехалі расіяне. А яны ж звыклі, што за ўсё трэба плаціць. Вось і… Вінаватага за самаўпраўства пакаралі. Пытанне, няўжо з грамадзян далёкага замежжа будуць браць грошы, выклікала смех. Не!

Былі мы на пераправе ўдзень, калі вада паднялася. Таму легкавыя аўто не заязджалі. А вось трактар, калі я «заступіў на змену», хай і не без цяжкасці, але патроху «забраўся».

Запусціць рухавік «Беларуса», які і цягне пераправу, не даверылі. Маўляў, няма пасведчання трактарыста. Ды і зусім невесела будзе, калі што здарыцца. А вось «рукамі памахаць», каб тэхніка заехала, аддаць канцы, калі ласка.

Безумоўна, у Сураж варта прыехаць не толькі дзеля парома. Недалёка цудоўны вялікі пляж. Расказалі, што пясок там, «як марскі», ды і крынічка недалёка. Мясцовы лясгас добраўпарадкаваў месца адпачынку… А ў іншы бок — старая брукаваная дарога, на якую мы заехалі выпадкова.

Аляксандр Пукшанскі
"Звязда"

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдефануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ

ГЛАВНЫЙ ПРАЗДНИК

Монополия на власть невозможна без приватизации истории. Здесь стоит вспомнить Оруэлла: «Кто владеет настоящим, тот владеет прошлым, а кто владеет прошлым, тот владеет будущим».

Раз в год НИСЭПИ составляет рейтинг доверия к государственным и общественным институтам. В тройке лидеров вместе с православной церковью неизменно оказывается армия. Откуда такая популярность у народа, чей национальный гимн начинается словами: «Мы, белорусы, - мирные люди»?

Начну с экономического парадокса. Добывая около 1,5 миллиона тонн нефти в год, республика-партизанка экспортирует 13-14 миллионов тонн нефтепродуктов. Как такое возможно?

С формальной точки зрения понять этот парадокс очень просто. На территории Беларуси еще в советское время были построены два мощных нефте-перерабатывающих завода. Но зачем? В БССР до распада Советского Союза на 1000 жителей приходилось менее 50 легковых автомобилей. Сегодня - около 300. Советский Союз нефтепродукты не экспортировал. Так кто же их потреблял? Главным потребителем была армия. Под каждым белорусским кустом находилась воинская часть.

Еще один пример. В 1974 году я окончил химический факультет БГУ. Одновременно с дипломом мне вручили военный билет лейтенанта химических войск. Все советские молодые люди в вузах параллельно осваивали воинские специальности.

После окончания университета и до распада Советского Союза в 1991 году я проработал на предприятии электронной промышленности (ПО «Интеграл»), что специализировалась на выпуске электронных компонентов для систем вооружений. Таким образом, весь советской период моей жизни был связан с армией. При этом в армии я ни одного дня не служил.

Пошлая девушка Елизавета I

Российское государство на протяжении 1000-летней истории развивалась как милитаристкая. Сам факт наличия мощной армии не делает государство таким. Милитаристское государство - это такое государство, в котором военная жизнь не только во время войны, но и в мирное время выстраивается по военному образцу. Гражданское население при этом управляется как армия.

Если мы обратим свой взгляд в прошлое, то увидим, что в московской Руси все население делилось на командиров, солдат и работников. Задача работников заключалась в том, чтобы кормить командиров и солдат. Такая социальная структура сохранялась до конца XX века.

Милитаризацию жизненного уклада передает язык. Все, что происходило в СССР, официально называлась «борьбой» и «штурмом». В телевизионных новостях уборка урожая подавалась как «битва за урожай». Школьники на уроках литературы писали сочинения на тему «Из одного металла льют медаль за бой, медаль за труд». Советское государство заботилось о здоровье населения, но только потому, что нуждалась в здоровых солдатах.

Социальная система, управляемая как армия, несовместима с рынком. Таким образом, она несовместима с частной собственностью. Еще в XIX веке английский философ Герберт Спенсер указал на наличие двух типов социальной организации - «воинственной» и «промышленной». Соответственно, двух типов кооперации - «насильственной» и «добровольной». Пример первого типа - армия, где люди подчиняются приказам, а все ресурсы распределяются административными методами. Пример второго типа - контрактная система, в которой производители и потребители добровольно обмениваются услугами.

Спенсер считал, что «воинствующий» тип социальности прошли все народы. Вспомним средневековую Европу. Феодализм представлял собой одну из моделей милитаристской организации госу-дарства и социума. Феодалы владели землей в обмен на службу. Но в феодальной иерархии у вассалов были не только обязанности, но и права.

В этом смысле на Руси феодализма никогда не было. Один пример. В британских архивах было найдено письмо царя Ивана Грозного королеве Елизавете I. Он был написан 28 октября 1570 года. Приведу самый яркий фрагмент письма: «У тебя люди торговые думают не о государственном удобстве, а о своих личных. И потому есть ты пошлая девица ».

А теперь перенесемся в современность. «Если государство скажет, что я должен отказаться от компании, я откажусь. Я сразу все отдам». Это высказывание одного из богатейших людей России, «алюминиевого короля» Олега Дерипаски.

Демилитаризация как проблема

Для понимания остроты современного момента обратимся к пословице: «Пережили голод, переживем и изобилие». Странная, на первый взгляд, пословица. Получается, что простому человеку жить легче в условиях недостатка, чем в условиях экономического процветания.

Всеслогично. Милитаристское государство может быть стабильным только в условиях чрезвычайного положения, высшим проявлением которого является война. Война оправдывает полное бесправие человека перед государством. Война оправдывает принудительное перераспределение ресурсов. Война не требует от человека выбора. Он должен просто выполнять команды.

Милитаризм, как и разруха, - не в клозетах, а в головах. Поэтому в условиях мира привычные ценности разрушаются. Героизм и борьбу за общий интерес начинают вытеснять интересы частной жизни. Но удовлетворять такие интересы милитаристская держава не способна по определению. Нет рынка. Следовательно, нет и механизма обратной связи с материальными интересами простых людей.

В условиях чрезвычайного положения формируется элита, способная отвечать на внешние и внутренние угрозы. В демократических государствах отбор лучших во власть осуществляется через механизм выборов. В милитаристских государствах сама чрезвычайная обстановка

(працяг на стар. 4)



ПРАЦОЎНАЯ МІГРАЦЫЯ

БЕЛАРУСЬ – ДОНОР ЛЮДСКИХ РЕСУРСОВ

В то время как граждане стран Евросоюза и даже Средней Азии бегут из охваченной шовинизмом и экономическим кризисом России, белорусы в поисках лучшей жизни, наоборот, стремятся к восточным соседям.

По данным Федеральной миграционной службы (ФМС) Российской Федерации, за последний год (с апреля 2014-го и по настоящее время) количество белорусских мигрантов в этой стране увеличилось на 137,2 тыс человек или на 34,4%. Активнее наших сограждан за этот период переезжали только украинцы. Армия украинских мигрантов в РФ пополнилась на 950,1 тыс человек или на 59,2%. Прирост произошел в основном за счет беженцев из охваченного войной Донбасса.

Примечательно, что по масштабу миграции в Россию белорусы опередили даже вездесущих китайцев, а также граждан Казахстана и Армении. За последний год китайская диаспора в России выросла на 44,4 тыс человек (21,1%), казахстанская — на 78,1 тыс (13,8%), армянская — на 36,9 тыс (8%).

Именно Украина, Беларусь, Казахстан, Китай и Армения обеспечили за последний год России положительное миграционное сальдо: 163,4 тыс человек.

А вот жители Евросоюза и других стран Запада активно уезжают из России. В частности, за последний год уехали 108,5 тыс граждан Германии и 44, 4 тыс обладателей финских паспортов. Всего за этот период РФ покинули около 400 тыс граждан государств ЕС, США, Австралии, Новой Зеландии, Норвегии. Главная причина — обострение политической ситуации, рост шовинистических настроений в российском обществе.

Бегство граждан средне-азиатских государств из России связано с экономическим кризисом. Наибольший отток зафиксирован среди мигрантов из Узбекистана и Таджикистана: соответственно 300,7 тыс и 108,6 тыс человек.

Как свидетельствуют данные ФМС на апрель 2015 года, белорусская диаспора в России насчитывает 536,3 тыс. человек. Наши соотечественники занимают 7-е место по численности во всей 11-миллионной армии мигрантов.

Самое большое представительство имеет Украина: 2 млн 554,9 тыс. человек (23,3% от общего количества мигрантов), далее следует Узбекистан — 2 млн 104,1 тыс. (19,2%), Таджикистан — 971,8 тыс. (8,9%), Казахстан — 644,4 тыс. (5,9%), Азербайджан — 555,8 тыс. (5,1%) и Молдова — 553,2 тыс. (5,1%).

Николай Адашкевич
"Заўтра тваёй краіны"

СМІ РАСІІ

КРАМЛЁЎСКАЯ ЦЭНЗУРА

Выступаючы ў Маскве 10 траўня, канцлер Нямеччыны Ангела Мэркэль назвала расейскую анэксію Крыму «злачыннай». Перакладчык на расейскую апусціў гэтае вызначэньне, ня трапіла яно і ў афіцыйную крамлёўскую справаздачу.

10 траўня на прэсавай канфэрэнцыі ў Маскве, канцлер Нямеччыны Ангела Мэркэль заявіла: «Мы дасягнулі супрацоўніцтва паміж НАТО і Расеяй. У сувязі з крымінальнай і незаконнай, паводле міжнароднага права, анэксіяй Крыму і ў сувязі з ваенным канфліктам на Ўсходняй Украіне, гэтаму супрацоўніцтву была нанесеная сур'ёзная шкода.»

Вызначэньне «злачынная», аднак, не было перакладзенае перакладчыкам-сынхраністам на расейскую мову падчас прэсавай канфэрэнцыі. Тыя, хто слухаў толькі перакладчыка, атрымалі ўражаньне, што Мэркэль лічыць захоп Крыму толькі «парушэньнем міжнароднага права.»

Няясна, ці перакладчык сьвядома зьмякчыў фармулёўку, якую ўжыла нямецкі канцлер. Але ў любым выпадку, менавіта больш мяккая вэрсія выступу Ангелы Мэркэль прадстаўленая на сайце Крамля ў афіцыйнай стэнаграме прэсавай канфэрэнцыі. У расшыфроўцы выступу, апублікаванай канцылярыяй нямецкага канцлера, фармулёўка пра «злачынную анэксію» Крыму прысутнічае.

Прынамсі, адзін чалавек зразумеў слова «ver-brecherisch»(злачынны—ням.), якое ўжыла Мэркэль — гэта Ўладзімер Пуцін. У свой час ён служыў у прадстаўніцтве КДБ СССР у Дрэздэне, ён свабодна валодае нямецкай мовай.

Падчас прэсавай канфэрэнцыі ў яго быў навушнік на левым вуху, праз які ён мог слухаць пераклад. Але правым вухам, вольным ад навушніка, ён мог слухаць выступ кіраўніцы нямецкага ўраду.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ

(пачатак на стар. 3)

выталкивала наверх тех, кто способен брать на себя ответственность.

В конце 1980-х годов Михаил Горбачев провозгласил политику разрядки, политику демилитаризации. Америка перестала быть главным врагом СССР, что стало одним из факторов распада советской империи. Нет врагов - нет и нужды в авторитарном государстве.

Горбачев наивно надеялся, что демилитаризация страны поможет решить текущие проблемы. Но он выпустил джинна из бутылки. Демилитаризация - это не решение проблемы, это сама проблема.

Что мы имеем сегодня? С конца XX века мир живет в условиях отсутствия угрозы большой войны. К чему это привело?

По количеству долларовых миллиардеров Россия занимает пятое место в мире (108 человек в 2014). На первом месте США - 515 миллиардеров. В пять раз больше, чем в России. ВВП США также в 5 раз больше, чем в России. Но история американских миллиардеров насчитывает около 100 лет. Первый был Джон Рокфеллер. В то же время русские создали свои богатства буквально из ничего за 20 лет.

Разумеется, управлять друзь-ями-миллиардерами может только главный миллиардер. Мнения экспертов об имуществе Путина расходятся. Суммы фигурируют от 40 до 200 миллиардов долларов. Но есть вещи, которые современная фотоаппаратура позволяет оценить точно. Это часы. Официальный доход Путина в 2011 году составил около 120 тысяч долларов, а стоимость коллекции часов превысил его годовой доход в 6 раз.

Приватизированная Победа

Государственная бюрок-ратия, сформированная в чрезвычайных условиях, способна отдавать и выполнять приказы, но она не в состоянии функционировать в правовой среде. Поэтому, как только угроза большой войны отпала, в странах СНГ началась деградация национальных властных «вертикалей». Каждый чиновник на своем рабочем месте превратился в маленького президента. И все, что сегодня связывает больших и маленьких президентов вместе, - это борьба за поддержание стабильности, под которой они понимают сохранение личной власти.

Ни о каком развитие при этом не может быть и речи. Поэтому умерла идеология, ибо некому сформулировать образ будущего. Элиты заняты личным обогащением. Обогащаются они не за счет создания, а, в первую очередь, за счет расхищения государственных бюджетов всех уровней. И в этом смысле они могут быть чрезвычайно эффективными. Один пример. Зимние Олимпийские игры в Монреале стоили 6 миллиардов долларов. В Сочи - более 50 миллиардов. Чувствуете разницу?

Элиты, не способные сформулировать образ буду-щего, пытаются приватизировать прошлое. Победа в Великой Отечественной войне - его центральный опорный символ и повод для национальной гордости.

«День Победы, - отмечает директор «Левада-Центра» Лев Гудков, - становится все более значимым как в системе пропаганды, так и в системе легитимации власти. Нет других оснований, кроме постоянных отсылок к этому событию, к этой дате. Так происходит коллективное национальное самоутверждение. Важно понимать, что это не только победа над фашистской Германией, но и победа над Западом. СССР сделал то, что не смогли сделать все другие западные страны. Очень символическое событие».

Победа, в ее официальной трактовке, - это всегда «наша Победа», которую «мы никому не отдадим». Отсюда постоянные призывы ввести уголовную ответственность за фальсификацию истории Великой Отечественной войны. Под фальсификациями, естественно, подразумеваютсялюбыеоценки,которые противоречат оценкам приватизаторов.

Сергей Николюк
"Новы час"

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

УЛАДЫ РАСПАЧАЛІ ТРАЎЛЮ НЕЗАЛЕЖНАГА СТАРЭЙШЫНЫ

Ігар Грышанаў, старэйшына вёскі Стаўры Аршанскага раёна, збіраецца звярнуцца з заявай у міліцыю і пракуратуру, каб абаранілі яго права на асабістае жыццё. Да гэтага часу яму даводзілася змагацца толькі за правы аднасяльчан і адстойваць іх інтарэсы.

Ігар Грышанаў з 2004 года выконваў абавязкі старэйшыны вёскі. У мінулым годзе ААТ "Аршанская птушкафабрыка" зруйнавала вясковы клуб, не ўлічваючы пажаданні вяскоўцаў. Грышанаў ад імя стаўроўцаў звяртаўся за дапамогай у розныя інстанцыі, апошняя заява была скіраваная ў суд Аршанскага раёна. Заява па сутнасці не была разгледжана, паведамляе карэспандэнт КРЫНІЦА. INFO.

Праз тыдзень пасля паседжання суда, 30 красавіка, старшыня Бабініцкага сельсавета Марына Матвеева сабрала сход вяскоўцаў, каб выбраць іншага старэйшыну вёскі. Маўляў, Ігар Грышанаў не начуе ў вёсцы. Але жыхары не пагадзіліся з яе прапановамі і настойвалі на тым, каб застаўся Ігар Грышанаў. За яго пераабранне адзінагалосна прагаласавалі ўсе ўдзельнікі сходу. Не завяршыўшы сходу, Марына Матвеева села ў машыну і паехала з вёскі.

Вяскоўцы былі абураныя такімі паводзінамі мясцовага кіраўніцтва. Але замест таго, каб улічыць інтарэсы жыхароў і працягваць працаваць на паляпшэнне дабрабыту вяскоўцаў, старшыня Бабініцкага сельсавета распачала ў адкрытую траўлю на Ігара Грышанава.

5 траўня зранку Грышанаў патэлефанаваў у Бабініцкі сельсавет да старшыні з просьбай, каб да Дня Перамогі адрамантавалі агароджу ля могілак, якую зламалі трактарам. На што атрымаў адказ:

— Вы не з'яўляецеся старэйшынам. Я сама буду вырашаць, што і калі рабіць.

А праз гадзіну Матвеева прыехала на машыне і на шчыце для аб'яў і ў іншых месцах вёскі расклеіла аб'явы наступнага зместу:

«Па выніках праведзенага сходу грамадзян, ініцыятарам якога быў Бабініцкі сельскі выканаўчы камітэт, прапанаваныя старшынёй сельсавета кандыдатуры Шульгіной Р.Т. і Сліжовай А.Б., як старэйшынаў населенага пункта, падтрыманы не былі. Кандыдатура Грышанава І.І. на галасаванне не выносілася, таму што ён з'яўляецца пастаянным жыхаром Оршы і пражывае там у сваёй кватэры. (Далей указаны адрас кватэры, якая знаходзіцца ў прыватнасці Грышанава, але ў якой ён не жыве і не прапісаны – КРЫНІЦА.INFO) Таму ў цяперашні час пытанне аб выбранні старэйшыны вёскі не вырашана.

Усім грамадзянам па надзённых пытаннях звяртацца ў Бабініцкі сельсавет па нумарах тэл. 8033-399-99-87, 28-69-86, 28-69-72. Кожны чацвер з 11.30 да 13.00 будзе ажыццяўляцца выязны прыём грамадзян старшынёй Бабініцкага сельсавета на месцы прыпынку аўтакрамы».

Месца прыпынку аўтакрамы — ля дома Грышанава, насупраць знесенага клуба.

Ігар Грышанаў лічыць дзеянні ўладаў сельсавету парушэннем яго правоў і збіраецца пісаць заяву ў міліцыю аб разгалошванні адрэсы кватэры і звярнуцца ў пракуратуру.

krynica.info

КАМУНАЛЬНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ

СКОЛЬКО БЕЛОРУСЫ НЕ ДОПЛАЧИВАЮТ ЗА КОММУНАЛКУ?

Население полностью возмещает затраты на оказание жилищно-коммунальных услуг. Только белорусские власти не говорят об этом народу.

Понятная и прозрачная информация о государственных расходах – прекрасная идея для обратной стороны жировки и для веб-сайтов министерств и ведомств. Вот только что там напишут работники ЖКХ, если о формирование затрат и себестоимости коммунальных услуг чиновники ничего не могут объяснить даже президенту?

«До сих пор у меня полной ясности нет. Говорят, что населению надо возмещать 60% затрат и сегодня этого нет. А я скажу, что 70% есть! Потому что, во-первых, я не знаю истинных тарифов ЖКХ, и мне кажется, что эта себестоимость у них увеличена — факты приводили, она в два раза выше, чем могла бы быть», - утверждал Александр Лукашенко еще в 2013 году.

С тех пор ясности больше не стало, а правительство по-прежнему предполагает выйти на определенный процент возмещения населением затрат на оказание жилищно-коммунальных услуг. К началу 2015-го это должно было быть 60%, и весь 2014-й тарифы росли угрожающими темпами. До стопроцентного возмещения предполагалось прежде всего повысить цены на услуги с невысокой себестоимостью — техобслуживание жилфонда, водоснабжение, канализация, вывоз отходов, обслуживание лифтов.

Последнее подорожание 2014-го года состоялось 1 декабря, когда стоимость жировки для средней семьи из трех человек, проживающей в стандартной двухкомнатной квартире, выросла приблизительно до 420 тысяч рублей в месяц. Казалось бы, вот они заветные 60%. Но нет, Министерство ЖКХ заявило, что это по-прежнему 30% реальных затрат.

Складывается любопытная ситуация - как бы ни росли тарифы на коммуналку, белорусы никак не могут возместить государству все затраты на ЖКХ. А вот если бы тогда тарифы взяли и увеличили сразу в 3-4 раза, то удалось бы нам расплатиться с государством? Или это опять составило бы какое-то количество условных процентов?

А еще интересно узнать, за счет чего правительство покрывает разницу. Если мы постоянно платим 30%, то кто доплачивает остальные 70%?

Не сложно догадаться, что разница покрывается из государственного бюджета, который формируется за счет налогов, пошлин и прочих сборов, которые исправно платят все, включая «тунеядцев». Платят НДС и акцизы, когда покупают себе «чарку и шкварку» в магазине, платят пошлину, когда пригоняют и «растамаживают» иномарку, платят 13% подоходного налога, когда получают зарплату, а сверху платят еще 34% в Фонд социальной защиты населения.

Вот, например, в 2014-м из бюджета страны на статью «Жилищно-коммунальное хозяйство» было потрачено 11,35 трлн. рублей. И если разделить эту сумму на количество домохозяйств за вычетом тех, у кого нет горячей воды (а таких у нас до сих пор 20%), то получится в среднем 3,6 миллиона рублей в год, или 300 тысяч в месяц на домохозяйство.

Выходит, что в среднем в 2014 году мы платили 300 тысяч по жировке, а еще 300 тысяч через налоги в бюджет и по цепочке на ЖКХ. Но ведь от перекладывания денег из кармана в карман их больше не становится, не так ли?

Белорусы всегда платили 100% от стоимости услуг ЖКХ, хотя бы уже потому, что кроме нас за ЖКХ платить больше некому.

Так что «Кошт урада» предлагает поместить на обратной стороне жировки следующий текст: «Уважаемые клиенты, большое спасибо, что платите 100% стоимости и терпите качество наших услуг».

Владимир Ковалкин

ПАЛІТЫЧНЫЯ ВЯЗНІ

ПАДТРЫМКА ЕЎРОПЫ

Дэпутаты Еўрапейскага парламенту новага скліканя зноў вырашылі ўзяць апякунства над беларускімі палітзняволенымі.

Апякунства еўрапейскіх парламентарыяў над палітычнымі вязнямі мае паказаць беларускім уладам, што каштоўнасці дэмакратыі застаюцца важнымі нават на тле вялікіх геапалітычных зрухаў, адзначыла спадарыня Адамовіч.

Гэтая ініцыятыва еўрапейскіх дэпутатаў азначае, што ў кожнага з беларускіх палітычных зняволеных з'явіўся прадстаўнік у дэмакратычных інстытутах еўрапейскіх краін.

«Гэта чалавек, які, як мы (родныя палітзняволеных – рэд.) спадзяемся, будзе сачыць за падзеямі вакол нашых блізкіх і будзе нагадваць еўрапейскім палітыкам пра тое, што ў Беларусі, на жаль, дэмакратычныя зменаў не адбываецца, будзе дамагацца, каб з нашай дапамогай нашыя родныя былі на волі і Беларусь зноў вярнулася ў шэраг дэмакратычных краін», – заўважыла спадарыня Марына.

12 траўня ў Брусэлі прайшла сустрэча сваякоў беларускіх палітвязняў з прадстаўнікамі Еўрапейскага парламенту. Адным з пасланняў афіцыйнаму Менску стала стварэнне ў Еўрапарламенце адмысловай групы, якая будзе сачыць за лёсам палітзняволеных у Беларусі.

belsat.eu

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 16.05.2015 у 17.15
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.